# НЕ ЗГАСЛІ Ў ІМГЛЕ ЗАБЫЦЦЯ



Шэраг імён славутых дзеячаў мастацтва і культуры, творчасць якіх да нядаўняга часу была невядома шырокім колам грамадскасці, выяўлены дзякуючы даследаванням беларускай культуры, у прыватнасці, навуковым пошукам эпохі Рамантызму (XIX ст.). Яскравымі прадстаўнікамі рамантычнай культурнай парадыгмы з'яўляліся пісьменнікі І. Дамейка, Т. Зан, І. В. Мілеўскі, А. Міцкевіч, Г. Ржавускі, І. Храпавіцкі, Я. Чачот, В. Яжоўскі і інш. Патрыятычнымі поглядамі вызначаліся многія прадстаўнікі навуковай інтэлігенцыі. Археолагі, гісторыкі, лінгвісты, фальклnetwork, этнографы актыўна даследавалі асаблівасці матэрыяльнага побыту, традыцый, абрадаў, звычаяў і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, параўноўвалі з культурамі іншых нацый. Сярод няўрымслівых даследчыкаў беларускай даўніны зоркамі першай велічыні былі браты Канстанцін і Яўстахій Тышкевічы. Беларусь са старажытнымі замкамі, рассеянымі па краіне замчышчамі, гарадзішчамі і курганамі з дахрысціянскага часу выклікала ў іх вялікую цікавасць. З самага маленства навучыліся браты сягаць думкай і сэрцам па прасторах беларускай мінуўшчыны. Навукова-археалагічную і краязнаўчую дзейнасць Канстанцін і Яўстафій пачалі з вывучэння барысаўскіх і лагойскіх старажытнасцей, а пазней пашырылі свае даследаванні на іншыя рэгіёны Беларусі. Іх навуковыя працы вызначаліся шматграннасцю, фундаментальнасцю. Так, вялікую каштоўнасць для сучасных культуролагаў мае праца Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета пад статыстычным, геаграфічным, гістарычным, гаспадарчым, прамыслова-гандлёвым і медыцынскім кутом гледжання, з дадаткам звестак аб звычаях, спевах, прымаўках, народных уборах, чараўніцтве, забабонах…» (1847). Тры чвэрці яе займаюць апісанні курганоў, замчышчаў, гістарычныя ўспаміны, этнаграфічныя працы. Не меншую цікавасць уяўляе фальклnetwork раздзел.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзінай у Еўропе манаграфіяй, дзе этнічны рэгіён даследаваны шляхам падарожжа па рацэ, з'яўлялася выдадзеная ў 1871 г. К. Тышкевічам праца «Вілія і яе берагі». Яго пяру належаць манаграфіі «О курганах в Литве и Западной Руси» і «Исторические сведения о замках, городищах и курганах в Литве и Руси Литовской», апублікаваныя ў 1860-х гг. Працы Канстанціна і Яўстафія выдаваліся ў Берліне, Вільні, Кракаве, Патсдаме. На матэрыялах, знойдзеных падчас археалагічных даследаванняў, Тышкевічы стварылі першы на тэрыторыі Беларусі гісторыка-археалагічны музей, які размясціўся ў іх радавым маёнтку ў Лагойску, а пазней яго экспазіцыі сталі ядром Віленскага музея старажытнасцей. Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы паўстаюць перад сучаснікамі як сапраўдныя патрыёты беларускай зямлі, якія сваёй навуковай і грамадскай дзейнасцю адкрылі ўсяму свету багатую непаўторную духоўную і матэрыяльную культуру беларускага народа. Іх жыццё было поўнасцю аддадзена навуцы, станаўленню і развіццю айчыннай археалогіі, музеялогіі, рэгіянальнага краязнаўства, фалькларыстыкі і літаратуры.

Многія прадстаўнікі лагойскага княскага роду Тышкевічаў у Беларусі і за яе межамі ў розныя часы займалі высокія дзяржаўна-адміністрацыйныя і вайсковыя пасады, былі вядомымі дзеячамі культуры і мастацтва. Так, актрыса Беата Тышкевіч узнагароджана залатым медалём імя С. Ф. Бандарчука «За ўклад у сусветны кінематограф». Да нашага часу шырокай папулярнасцю карыстаюцца музычныя творы кампазітара Яна Тышкевіча.

На ўласныя сродкі Вінцэнта Тышкевіча ў Свіслачы была адкрыта адна з першых у Беларусі гімназія, выхаванцам якой з'яўляўся рэвалюцыянер-дэмакрат Кастусь Каліноўскі. Уладальнік Свіслачы выдаткаваў пад гімназію 1000 злотых і часовыя драўляныя будынкі, абавязаўся ў будучым зрабіць іх мураванымі. Граф Вінцэнт матэрыяльна падтрымліваў настаўнікаў, выдзяляў ім сродкі на наёмнае жыллё. Бедныя студэнты таксама атрымлівалі дапамогу для найму пакояў. Нашчадкі Тышкевічаў лагойскай галіны ў XX ст. уваходзілі ў склад інтэлектуальнай эліты розных краін свету: Англіі, ЗША, Канады, Францыі і інш. І цяпер яны падтрымліваюць гонар свайго радаводу. Шматгранная бескарыслівая дзейнасць прадстаўнікоў розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакаленняў роду Тышкевічаў у шматлікіх галінах грамадскага жыцця не магла не прыцягнуць увагу навукоўцаў, магістрантаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Навукова-творчая спадчына і грамадска-палітычная дзейнасць заснавальнікаў роду і іх нашчадкаў даследуецца ўжо больш за два дзесяцігоддзі вядучымі навуковымі школамі БДУКМ пад кіраўніцтвам прафесараў М. А. Бяспалай і А. І. Смоліка. Раз у два гады яе вынікі падсумоўваюцца на навукова-практычных канферэнцыях (Тышкевіцкіх чытаннях). Іх адметнасцю стала правядзенне навуковых імпрэз менавіта ў тых гарадах і мястэчках, дзе ў пэўныя часы гаспадарылі Тышкевічы. У Чытаннях заўсёды прымала ўдзел шырокае кола навуковай і творчай інтэлігенцыі Барысава, Валожына, Вілейкі, Свіслачы. Шостыя чытанні «Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве» адбыліся ў горадзе Крэтынгу (Літва). Як паказалі даследаванні беларускіх і літоўскіх навукоўцаў, прадстаўнікі радаводу Тышкевічаў зрабілі значны ўнёсак і ў культуру літоўскага народа. Па выніках канферэнцый выдаюцца зборнікі навуковых дакладаў іх удзельнікаў.

Сёлетнія Восьмыя Тышкевіцкія чытанні праводзяцца ў Ружанах, якія пэўны час належалі Тышкевічам, а ў 1598 г. былі набыты канцлерам ВКЛ Львом Сапегам, і з таго часу сталі рэзідэнцыяй княскага роду Сапегаў. Род герба «Ліс» лічыўся другім па значнасці (пасля Радзівілаў) княскім родам у ВКЛ. Яго прадстаўнікі Аляксандр Міхаіл, Багдан Сямёнавіч, Казімір Леў, Ян Казімір, Леў Іванавіч Сапега і інш. зрабілі шмат высілкаў для развіцця беларускай культуры. Так, Л. І. Сапега ўзначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы Статута Вялікага Княства Літоўскага, адрэдагаваў яго тэкст і фінансаваў яго выданне. Леў Іванавіч садзейнічаў развіццю беларускага кнігадрукавання, сабраў у Ружанах багатую бібліятэку.

Прыемна адзначыць, што цікавасць да праблемнага поля Тышкевіцкіх чытанняў не паменшылася нават у сувязі са складанымі эпідэміялагічнымі абставінамі. Ад імя рэктарата жадаю плённай працы Восьмым Тышкевіцкім чытанням, адкрыццяў новых цікавых імён!

*Н. У. Карчэўская, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ